Ахарактарызуйце ўжытыя ў першым абзацы тэксту лічэбнікі паводле значэння і будовы.

Адрэдагуйце другі абзац тэксту так, каб перадаць значэнне прыблізнай колькасці. Запішыце, замяняючы лікі словамі і ўстаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

У «Слоўніку сінонімаў і блізказначных слоў» М. Клышкі прыводзіцца наступны сінанімічны рад: *важнасць, значэнне; вага, сіла, ..., вастрыня (перан.).* Якое з ужытых у тэксце слоў прапушчана ў гэтым радзе?

**386.** Разгледзьце малюнак.




Складзіце і запішыце рэцэпт гатавання грэчкі па-купецку, ужываючы простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі.

## § 62. Скланенне, ужыванне і правапіс парадкавых лічэбнікаў

**387.** Прачытайце пары лічэбнікаў. Ад якіх лічэбнікаў утвараюцца парадкавыя лічэбнікі?

| | |
|---|---|
| чатыры — чацвёрты | шэсцьдзясят — шасцідзясяты |
| сямнаццаць — сямнаццаты | трыста — трохсоты |

Адзін з прыведзеных парадкавых лічэбнікаў спалучыце з назоўнікамі *год*, *старонка*, *аддзяленне*. Запішыце ўтвораныя словазлучэнні, вызначце род, лік і склон лічэбнікаў.

> Большасць парадкавых лічэбнікаў утвараецца ад колькасных, якія абазначаюць цэлыя лікі. Выключэнне: *адзін — першы, два — другі*.
>
> Парадкавыя лічэбнікі змяняюцца па родах, ліках, склонах, як прыметнікі.



Правауладальнік Акадэмія адукацыі

**388.** Прачытайце верш. Якая сітуацыя апісваецца ў ім?

**Кормяць Сяргейку**

Першая лыжка — за маміну ласку,
Другая — за татавы[м] гушканні-гулі,
Трэцяя — за бабуліны казкі,
Чацвёртая — за жалейку дзядулі,
Пятая — за пеўніка чубатага,
Шостая — за коціка-дуроніка,
Сёмая — за жаўрука над хатаю,
А восьмая — за наша сонца-сонейка,
Дзявятая — за веснавую раніцу...
Ну вось і каша ў місачцы канчаецца.

*М. Танк.*

Назавіце ўжытыя ў тэксце парадкавыя лічэбнікі. Пісьмова праскланяйце адзін з іх разам з назоўнікам, да якога ён адносіцца. Абазначце склонавыя канчаткі лічэбніка. Дакажыце, што парадкавыя лічэбнікі скланяюцца, як прыметнікі з адпаведнай асновай.

**389.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне парадкавых лічэбнікаў | |
|---|---|---|
| Н. | *сямідзясяты кіламетр* | *дваццаць трэці дзень* |
| Р. | *сямідзясятага кіламетра* | *дваццаць трэцяга дня* |
| Д. | *сямідзясятаму кіламетру* | *дваццаць трэцяму дню* |
| В. | *сямідзясяты кіламетр* | *дваццаць трэці дзень* |
| Т. | *сямідзясятым кіламетрам* | *дваццаць трэцім днём* |
| М. | *(на) сямідзясятым кіламетры* | *(аб) дваццаць трэцім дні* |

Якая частка слова змяняецца пры скланенні складанага парадкавага лічэбніка? Якое слова змяняецца пры скланенні састаўнога парадкавага лічэбніка?

!

Пры скланенні **складаных парадкавых лічэбнікаў *(пяцідзясяты — васьмідзясяты, двухсоты — дзевяцісоты)*** змяняецца апошняя частка слова.

Пры скланенні **састаўных парадкавых лічэбнікаў** змяняецца толькі апошняе слова.

**390.** Прачытайце тэкст. Якую ролю ў ім выконваюць лічэбнікі?

### Смольня

У 1910 годзе сям'я Міцкевічаў набыла сваю хату ў Смольні. 19 верасня 1911 года Якуб Колас прыехаў[сл] сюды ўпершыню. Паэт пасадзіў тут ліпы, якія і сёння растуць на мемарыяльнай сядзібе. Пад гэтымі ліпамі сядзелі маладыя Якуб Колас і Янка Купала ў час першай сустрэчы летам 1912 года.

У Смольні Якуб Колас працаваў над паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка», напісаў шэраг вершаў, апавяданняў.

У 1967 годзе ў Смольні быў адкрыты філіял* Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа *(Паводле З. Камароўскай)*.

Выпішыце з тэксту колькасна-іменныя словазлучэнні, замяняючы лікі словамі.

Вусна перакажыце тэкст, карыстаючыся выпісанымі колькасна-іменнымі словазлучэннямі як апорнымі.

**філія́л**

**391.** Запішыце словамі даты нараджэння ўсіх членаў вашай сям'і. Лічэбнікі якога разраду паводле значэння і граматычных прымет вы выкарысталі?

! Парадкавыя лічэбнікі, якія заканчваюцца на ***-тысячны, -мільённы, -мільярдны***, пішуцца ў адно слова: *дваццацімільённы, трохмільярдны, сямідзесяціпяцітысячны.*

**392.** Утварыце ад колькасных лічэбнікаў парадкавыя. Запішыце, замяняючы лікі словамі.

4 мільярды, 11 мільёнаў, 59 тысяч, 164 тысячы.

## *Гавары і пішы правільна*

Для абазначэння часу па-беларуску выкарыстоўваюць прыназоўнікі ***ў*** і ***а***. Напрыклад, калі на гадзінніку 9:20, кажуць: ***у*** *дзевяць гадзін дваццаць хвілін*, ***у*** *дваццаць хвілін на дзясятую.*

Калі ж на гадзінніку роўна 9:00 або 9:30, ужываюцца словазлучэнні ***а*** *дзявятай гадзіне*, ***у*** *дзевяць гадзін*; ***а*** *палове дзясятай*, ***у*** *палову на дзясятую.*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**393.** Складзіце і запішыце 5 сказаў на тэму «Расклад званкоў у нашай школе (гімназіі)».

**394.** Разгледзьце план глядзельнай залы кінатэатра.




Якія месцы ў глядзельнай зале вы выбераце, каб паглядзець фільм разам са сваімі сябрамі? Раскажыце, з кім бы вы хацелі пайсці ў кінатэатр. Назавіце выбраныя вамі рад, нумары месцаў. Растлумачце свой выбар.

**395.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

19 мая 1922 года была заснавана Усесаюзная піянерская арганізацыя. У першыя месяцы яе існавання актыўна фарміраваліся піянерскія атрады. У Беларусі першыя такія атрады былі арганізаваны ў Бярэзінскім раёне. Першы збор першага беларускага піянерскага атрада адбыўся 24 чэрвеня 1922 года.

Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя (БРПА) была створана 13 верасня 1990 года на дзясятым Рэспубліканскім злёце піянераў. У гэты дзень былі прыняты статут, дэвіз і законы беларускіх піянераў. У 2019 годзе ў піянераў Беларусі з’явіўся талісман — рысяня Агеньчык.

Сёння БРПА налічвае больш за 600 тысяч чалавек.

Візітнымі карткамі беларускіх піянераў з’яўляюцца спартыўна-патрыятычныя гульні «Зарніца» і «Зарнічка», фестываль-конкурс «Агеньчык запрашае сяброў», праекты «Тэрыторыя ведаў», «Тэрыторыя дзяцінства» і многія іншыя *(Паводле Л. Міцкевіч)*.

Чаму Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя адзначае Дзень піянерскай дружбы 19 мая?

Выпішыце з тэксту колькасна-іменныя словазлучэнні з парадкавымі лічэбнікамі, замяняючы лікі словамі. Вызначце род, лік і склон парадкавых лічэбнікаў.

Складзіце і запішыце працяг тэксту (3-4 сказы), дапоўніўшы яго паведамленнем пра адзін з праектаў або адну з акцый БРПА. Пры неабходнасці карыстайцеся інфармацыяй, змешчанай на сайце *brpo.by*.

## § 63. Скланенне, ужыванне і правапіс дробавых лічэбнікаў

**396.** Разгледзьце схемы. Якая частка кожнай схемы афарбавана сінім, зялёным колерамі?





Лічэбнікі якога разраду паводле значэння вы выкарысталі, каб адказаць на пытанне? Вызначце разрад гэтых лічэбнікаў паводле будовы.

**!** **Дробавыя** лічэбнікі абазначаюць частку цэлага або цэлы лік і яго частку: *пяць сёмых, дзве цэлыя і тры дзясятыя*.

Паводле будовы дробавыя лічэбнікі састаўныя. Яны складаюцца з колькаснага лічэбніка (лічнік) і парадкавага (назоўнік).

**397.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне дробавага лічэбніка |
|---|---|
| Н. | *чатыры пятыя гектара* |
| Р. | *чатырох пятых гектара* |
| Д. | *чатыром пятым гектара* |
| В. | *чатыры пятыя гектара* |
| Т. | *чатырма пятымі гектара* |
| М. | *(аб) чатырох пятых гектара* |

Якая частка дробавага лічэбніка змяняецца, як колькасны лічэбнік? Якая частка дробавага лічэбніка змяняецца, як прыметнік у множным ліку?

**!** Пры скланенні дробавых лічэбнікаў першая частка (лічнік) змяняецца, як колькасны лічэбнік, другая (назоўнік) — як прыметнік у множным ліку.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі